Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (154), 2026

УДК [94(476)+37(476)(091)] "08/12" EDN: CNUCMA

# Пераход ад традыцыйнай да кніжнай адукаванасці на беларускіх землях у IX–XIII стст. (Частка 2)

В.А. ПІЛЕЦКІ

Праведзена даследаванне пераходу ад традыцыйнай да кніжнай адукаванасці на беларускіх землях у IX–XIII стст. пад уплывам зараджэння дзяржаўнасці і хрысціянізацыі насельніцтва ўсходнееўрапейскага рэгіёну.

**Ключавыя словы:** традыцыйная адукаванасць, гістарычная трансляцыя грамадскага досведу, пісьменнасць насельніцтва, выхаваўча-адукацыйны працэс, кніжная адукаванасць.

A study has been conducted on the transition from traditional to book-based education in the Belarusian lands in the IX–XIII centuries under the influence of the emergence of statehood and the Christianization of the population of the Eastern European region.

**Keywords:** traditional education, historical translation of public experience, literacy of the population, educational process, book-based education.

(*працяг артыкула, пачатак у № 4 (151), 2025 г.*)

Цікава, што зыходзячы са зместу тых «навук», якія першапачаткова «выкладаліся» падчас гэтага «вучэння кніжнага», зусім не было таго, што можна было б неяк звязаць з паняццем «перадача жыццёвага (ці навуковага) сацыяльнага досведу».

Адбывалася звычайная катэхізацыя. Тое, што ў царкоўнай практыцы называюць «абрадам абвяшчэння» (рус. «оглашения») [1]. Падчас яе вырашалася задача: змяніць свядомасць, вобраз жыццядзейнасці, комплекс маральных, культурных і светапоглядных арыенціраў чалавека, які знаходзіўся ў палоне язычніцкага светаўспрымання. Паставіць яго на шлях хрысціянізацыі. *«Катэхізацыя ... (адзначаў член французскай акадэміі, тэолаг і гісторык, Жан Даніэлу – В.П.) накіравана на тое, каб прывесці канкрэтнае жыццё (катэхумена – В.П.) у адпаведнасць з верай, якой ён прытрымліваецца. Верыць у Хрыста – значыцъ змяніць сваё жыццё...»* [2, р. 125].

Змест гэтай катэхізацыйнай падрыхтоўкі уключаў базавыя (элементарныя) веды, якія знаёмы любому шэраговаму хрысціяніну. Вучылі асновам веры, якія сфармуляваны ў т. зв. «Сімвале веры». Малітву «Ойча наш». Засвойвалі «Закон Божы» (Дэкалог) у выглядзе «Дзесяці біблейскіх запаведзяў». Тлумачылі абавязкі хрысціяніна ў адносінах да Бога, да людзей і да самога сябе. Прывучалі пасціцца ў названыя царквой перыяды. Важнай часткай было «вучэнне» пра грахоўнасць чалавека. Пра «першародны грэх». Знаёмілі з паняццем «страх Божы». Называліся сем смяротных грахоў. Заключнай часткай было знаёмства з сутнасцю царкоўных сакраментаў (хрышчэнне, памазанне, пакаянне, прычашчэнне, шлюб, святарства і сабораванне) і абраднасцю, звязанай з імі.

Навучанне прасцейшым (элементарным) «навукова-рацыянальным» ведам (найперш чытанню і спевам) царква распачала не адразу і не з нагоды нейкіх альтруістычных мэтаў (накшталт «павышэння ўзроўню адукаванасці грамадства»). А з неабходнасці ўмення чытаць напісаныя тэксты малітваслоўя і прымаць удзел у царкоўных песнапеннях падчас багаслужэнняў. Спачатку для ніжэйшых царкоўных слу́жак (іпадыяканаў, псаломшчыкаў, дзякаў, чытальнікаў, пеўчых), а потым і для простых вернікаў.

Важным пытаннем у размове пра перадачу міжпакаленнага сацыяльнага досведу з'яўляецца праблема засваення кніжнай граматы дзецьмі з ваенна-феадальнага асяроддзя. Калі (на якім этапе жыцця)? Дзе? І якія веды? засвойвалі будучыя землеўласнікі (і прадстаўнікі кіруючага саслоўя). Адказы на гэтыя пытанні таксама сведчаць пра асаблівасці практычнай рэалізацыі выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

Пачнём з таго, што хрысціянізацыя ўсходнееўрапейскіх тэрыторый, як было сказана вышэй, паставіла на парадак дня *«вучэнне кніжнае»*. І нам вядома з розных тагачасных гістарычных крыніц, што дзеці прывеліяваных пластоў насельніцтва (і найперш нашчадкі

князёў) даволі часта валодалі граматай. Так, адзін з сыноў Яраслава Мудрага (нашчадка полацкай княжны Рагнеды) ведаў пяць замежных моў. Вядомы пячаткі князёў (*«кніжніка»* Ізяслава, полацкага князя), а таксама княгінь (маці Еўфрасінні Полацкай і самой Еўфрасінні). Ёсць звесткі пра «Барысавы» камяні і «Рагвалодаў камень», «берасцяныя граматы». Існуюць тэксты твораў нашага знакамітага «златавуста» Кірылы Тураўскага, што жыў у XII ст. Шырока вядомы факты пра адукаванасць і дзеянні па адкрыцці школ нашай «нябеснай апякункі Беларусі» Еўфрасінні Полацкай. Факты з жыцця, адукаванасць, кар'ерныя перыпетыі Кліма Смаляціча і Аўраамія Смаленскага і многае іншае. Усё гэта сведчыць пра відавочную распаўсюджанасць пісьме́ннасці на беларускіх землях у азначаны гістарычны перыяд (аргументуем гэта ніжэй).

Дзе набываліся такія веды? «Аповесць мінулых гадоў» сведчыць, што самымі першымі з дзяцей усходнееўрапейскага рэгіёну (і Беларусі ў тым ліку), хто трапіў у навучанне, былі дзеці нейкай *«нарочитое чади»*. Менавіта іх, па распараджэнні князя, пачалі *«поимати… и даяти … на оученье книжное…»* [3, с. 51]. Чые гэта былі дзеці?

(<u>*Даведка*</u>: Тэрмін «нарочитое чади» складаецца з двух лексічных адзінак, якія ў слоўніку Ізмаіла Сразнеўскага тлумачацца наступным чынам: «нарочит[-ыи]» – *«…важный, почётный, знатный…»* [4, с. 323]; «чад[-ъ]» – «дети», «народъ», «дружина» [5, с. 1469–1470] (*канец Даведкі*).

Інакш кажучы, дзеці, якіх *«поимали… на оученье книжное»*, па загаду кіраўніка дзяржавы адразу ж пасля хрысціянізацыі былі дзецьмі прадстаўнікоў найбліжэйшага атачэння князя. Хутчэй за ўсё нашчадкамі дружыннікаў і баяр.

І гэта зразумела. Пераход на новае веравызнанне, якое павінна было ідэалагічна ахоўваць феадальна-антаганістычны лад. Дзе грамадства было падзелена на два саслоўна-класавыя пласты. Феадалаў і залежных сялян смердаў (а таксама гараджан, рамеснікаў, купцоў). Было надзвычай важнай грамадскай акцыяй.

Новую ідэалогію, канешне ж, павінны былі «прывіваць» насельніцтву тыя, хто быў найбольш зацікаўлены ў ёй. Прадстаўнікі феадальнага саслоўя. А *«вучэнне кніжнае»*, як сказана вышэй, было разлічана найперш на падрыхтоўку служыцеляў царквы. І канешне, іх кадравы склад павінен быў рэкрутавацца за кошт феадальнага асяроддзя.

Тым больш вядома, што прадстаўнікі царкоўнай адміністрацыі ў хрысціянстве заўсёды былі феадаламі. Навукова-гістарычная літаратура падзяляе феадальнае саслоўе на «свецкіх» і «духоўных» феадалаў. *«Супольнасць служыцеляў Госпада, …здавалася б, павінна была быць (аддаленай ад – В.П.)… зямны[-х] клопата[-ў], але пры гэтым яна знайшла сваё месца ў спецыфічнай феадальнай структуры грамадства…»*, – пісаў вядомы французскі даследчык феадалізму Марк Блок [6, с. 339]. *«…абаты, біскупы, … арцыбіскупы. Па сваім багацці, магчымасцях і ўладзе гэтыя магутныя князі царквы ані як не саступалі самым уплывовым свецкім баронам…»* [6, с. 339].

Якую адукацыю (з якім зместам?) атрымлівалі дзеці – прадстаўнікі ваенна-феадальнага саслоўя? Канешне, пачаткова, як сказана вышэй, гэтае *«вучэнне»* было выключна катэхізацыяй. Яна тлумачыла царкоўна дактрынальныя пастулаты і *«…пры[-водзіла] канкрэтнае жыццё (катэхумена – В.П.) у адпаведнасць з верай, якой ён прытрымліваецца…»* [2, p. 125].

Сам тэрмін *«вучэнне (ці: чытанне – В.П.) кніжнае»*, які звычайна ўспрымаецца нашымі сучаснікамі (жыхарамі XXI ст.) як непасрэднае навучанне (ці: чытанне кніг) з мэтай засваення нейкай інфармацыі (вучэбна-навуковай, пазнавальнай, забаўляльнай, ці інш.), на той час азначаў зусім іншую рэчаіснасць.

Царкоўна-хрысціянскі «рытуал» чытання датычна той эпохі меў выключна ідэалагічны характар і часцей за ўсё нават не меў нічога агульнага з разуменнем прачытанага. Ён, як правіла, быў адной з форм катэхізацыі. Быў разлічаны на тое, што хрысціянін падчас працэса чытання будзе ўспрымаць «слова Божае». Прычым яго не абавязкова было разумець (і імкнуцца ўявіць гэта ў сапраўднасці). Яно ўвогуле магло мець міфалагічны сюжэт, зусім не звязаны з грамадскай рэчаіснасцю. У яго патрэбна было верыць.

Царкоўна-хрысціянская дактрына прапаноўвала чалавеку, які рыхтаваўся стаць хрысціянінам, спецыяльны статус: *«адрачэнне ад сябе»*. Інакш адвярнуцца *«ад любові да сябе»; «ад сваіх прыхільнасцяў»; «ад сваіх мэтаў і жаданняў»; «ад сваіх перакананняў»; «ад сваёй маёмасці»*) [7]. Вядомы біблейскі тэзіс, выкладзены ў Евангеллі ад Лукі, сведчыць пра тое, што Хрыстос, звяртаючыся *«…да ўсіх сказаў: калі хто хоча ісьці за Мною, адкінь (адрачыся ад – В.П.) сябе, і вазьмі крыж свой, і ідзі за Мною. Бо хто хоча душу сваю зьберагчы, той страціць яе; а хто страціць душу сваю дзеля Мяне, той зьберажэ яе…»* [8].

Даволі трапны погляд адносна *«вучэння кніжнага»* выказаў А.А. Штэц (докт. пед. навук, прафесар Мурманскага інстытута): *«...асноўная функцыя кнігі (у той час была – В.П.) – не пазнавальная, а “душакарысная” (рус.: “душеполезная”). Яна у “вучэнні кніжным” (была – В.П.) “падобная іконе – гэта духоўны аўтарытэт і духоўны кіраўнік”. Чытанне кніг успрыма[-лася] як богаўгодная справа і як маральны абавязак...»* [9].

Наглядным прыкладам гэтага можа быць вядомы многім эпізод з сучаснага жыцця (XXI ст.). Калі каля якога небудзь храма альбо ў пераходзе метро стаіць (сядзіць) старэнькая жанчына (каля скрыні для збору царкоўных ахвяраванняў) і бесперапынна чытае Біблію. Для чаго яна гэта робіць? Няўжо для разумення прачытанага? Ці, усё-ж, для ўздзеяння на тых, хто праходзіць міма? Ну, відаць, хутчэй апошняе. Каб «уразіць» прахожага вось такой «адданасцю святасці» і вымусіць зрабіць ахвяраванне.

Чытанне (ці: вучэнне) кніжнае, як дзейснае паняцце перыяду хрысціянізацыі, дыяметральна адрознівалася, па сутнасці, ад сённяшняга свайго разумення.

Але так працягвалася не доўга. Паступова адукаванасць пачынала ўваходзіць у жыццё грамадства і першадзяржаўных утварэнняў (княстваў). І папаўнялася акрамя чытання і спеваў (неабходных для ўдзелу ў літургіі) элементарнымі ведамі адукацыйнага кшталту: пісьмом і прасцейшымі арыфметычнымі дзеяннямі. Якія, акрамя вырашэння царкоўна-ідэалагічных задач, былі запатрабаваны патрэбамі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Найперш, гандлю, мытнай службы і падатковай сферы.

Мы ўжо прыводзілі вытрымку з Дагавора з Візантыяй ад 907 г., падпіснага пасля чарговага ваеннага паходу і перамогі над Візантыяй, дзе Полацк разам з гарадамі Кіеўскага княства, атрымаў права на даніну. Якую хтосці сярод палачан (прычым, не адзін ці два чалавекі, а цэлая дзяржаўная служба) павінен быў лічыць, а таксама займацца вызначэннем колькасці ўнутраных феадальных данін на карысць дзяржавы.

Развіваўся гандаль. Ён быў даволі актуальны на той час, найперш, з-за наяўнасці геапалітычнага месцараспалажэння. Вядома, што этнаграфічна беларускія землі (Полацкае, Тураўскае, Смаленскае княствы) геапалітычна былі размешчаны на перакрыжаванні міжнародных гандлёвых шляхоў [10]. А гэта таксама стымулявала патрэбу ў валоданні прыкладной граматай (лічэнне, пісьмо, валоданне замежнымі мовамі).

Самых вядомых гандлёвых шляхоў на той час было некалькі: па рацэ Заходняя Дзвіна на Поўначы [11]; у паўднёвай частцы Беларусі (па рацэ Прыпяць і сістэме рэк Піна, Мухавец, Заходні Буг) [12]; з Поўначы на Поўдзень (шлях з Варагаў у Грэкі) [13]. А таксама ўнікальны шлях, што праходзіў праз рэкі Прыпяць, Ясельда, Шчара, Нёман (па дыяганалі тэрыторыі Беларусі з Поўдневага Усходу на Паўночны Захад). І быў самай кароткай гандлёвай артэрыяй, якая звязвала г. Кіеў з востравам Готланд. А апошні, як вядома, пачынаючы з XII–XIII стст., быў адным з цэнтраў паўночна-еўрапейскага гандлёвага саюза «Ганзы» [14]. Канчатковае афармленне гэтага шляху закончылася пазней будаўніцтвам Агінскага канала [15, с. 32].

Усе названыя накірункі звязвалі праз беларускія тэрыторыі дзесяткі народаў з розных рэгіёнаў Еўропы і Азіі. Па гандлёвых шляхах ішлі бясконцыя патокі грузаў, якія, відаць, з дапамогай мытні (што пацвярджаецца, у тым ліку, і знаходкамі *свінцовых пломбаў* на месцы горада Дарагічына на Беласточчыне [16]), эканамічна кантраляваліся полацкімі, тураўскімі і смаленскімі князямі.

За праход суднаў па тэрыторыі княстваў збіралі даніну і размяркоўвалі яе на дзяржаўныя патрэбы. Некаторыя гісторыкі лічаць, што сродкі, атрыманыя за кошт гандлёвых шляхоў, былі адным з важнейшых фактараў, што паскараў станаўленне дзяржаўнасці ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне [17, с. 55–57]. Няўжо тут ніхто не ўмеў лічыць і займацца з дапамогай лічэння пытаннямі эканомікі першадзяржаўных утварэнняў? Канешне, адукаваныя людзі меліся, тым больш, што ў многіх з тых краін, з якімі ажыццяўляўся гандаль, адукацыя была развіта за многа стагоддзяў да названых падзей, яшчэ з эпохі антычнасці.

Як і дзе вучыліся дзеці князёў? Дакладна нам гэта не вядома. Хутчэй за ўсё гэта адбывалася падчас хатняга выхавання ў межах «перыяду грыдніцы». Хто іх вучыў? Не выключана, што былі нейкія спецыяльна прызначаныя людзі, якія займаліся праблемай навучання грамаце будучых спадчыннікаў дзяржаўнага прастола. Як яны называліся ў той час, сказаць цяжка. Разам з тым гістарычная крыніца 1313 г.: *«Ярлык ... Кіпчакскага Цара*

*Узбека (гг. кір.: 1313–1341 – В.П.) Пятру Мітрапаліту……аб нечыненні крыўд цэрквам і святарам, аб недатыкальнасці іх маёмасці…»* [18, с. 8] сведчыць аб тым, што ў «слоўнікавым запасе» жыхароў усходнееўрапейскіх тэрыторый X–XIII ст. меліся такія тэрміны, як *«учителны[-е] людски[-е] повъстник[-и]»* і *«книжник[-и]»*.

Тэрмін «кніжнік», канешне, больш шырокі. Ён, хутчэй, датычны да царкоўнай гісторыі. Пазначае дасведчанага чалавека, знаўцу і тлумачальніка Святога пісання. А што да слова «повстнік», то яго значэнне, калі ўлічыць меркаванне навуковых крыніц, даволі блізкае да справы навучання і падахвочвання да авалодвання навукамі.

(Даведка: У слоўніку І.І. Сразнеўскага маюцца наступныя тэрміны:

– «повстьникъ» (альбо: «пооустник») – «*…побудитель, поощритель, (наставник)…*»;

– «повчати» (альбо: «поучати») – «*…научать, обучать…*»;

– «повчатиса» – «*…учиться, научаться…*» [4, с. 323] (*канец Даведкі*).

Тым больш, калі тэрмін гэты дадзены ў складзе такой красамоўнай лексемы, як «*учителны[-е] людски[-е] повъстник[-и]*». Дзе даволі дакладна бачна, што гэта былі нейкія прафесіяналы са спецыфікацыяй, накіраванай на навучанне людзей. Каго яны вучылі? На якіх умовах? Якія веды выкладалі? Усё гэта пакуль (з-за недахопу гістарычных крыніц) застаецца «закрытай» на сённяшні дзень інфармацыяй. Але тое, што яны былі. Што грамадства ведала такіх штучных спецыялістаў. Нейкіх «майстроў граматы» (можа вандроўных) – гэта даволі красамоўны факт для даследавання праблемы перадачы грамадскага досведу ў той далёкі перыяд.

Ці маглі яны быць прыцягнуты да выканання такой справы, як навучанне грамаце будучых пераемнікаў княжацкай улады? Так, канешне. Дзеці князёў былі найбольш магчымымі іх навучэнцамі. Тым больш, што вынікі такога навучання (адукаванасць менавіта спадкаемцаў княжацкіх прастолаў) маюць пераканаўчае пацверджанне ў гісторыі нашай краіны.

Так, у «Павучанні Манамаха» сказана, што сын кіеўскага князя Яраслава Мудрага Усевалад, жывучы ў Кіеве, вывучыў пяць замежных моў. «*…умеючи … не забывайте доброго, а … не умеючи ... (учитесь – В.П.), якоже бо отець мой (Всеволод Ярославич / 1030 –1093/ – В.П.) дома седя, изумеяше 5 языкъ, в томъ бо честь есть от инехъ земль…*» [19, с. 57]. Ёсць меркаванне, што ён ведаў грэчаскую, лацінскую, польскую, шведскую і нарвежскую мовы. Сам Яраслаў Мудры, як вядома, быў сынам полацкай князёўны Рагнеды.

Была пісьме́ннай і дачка Яраслава Мудрага Ганна (унучка Рагнеды), якая стала пазней каралевай Францыі (у 1049–1075 гг.), жонкай французскага караля Генрыха I. Захаваўся нават яе аўтограф, якім яна падпісвалася, будучы ўжо каралевай. Можна выказаць здагадку, што адукаванымі людзьмі былі і іншыя сыны Яраслава: Ізяслаў і Святаслаў Яраслівічы, пра якіх сведчыць знакаміты «Ізборнік вялікага князя Святаслава» [20].

Адукаваным быў і сын Рагнеды, полацкі князь Ізяслаў (каля 978–1001). Нездарма складальнік Патрыяршага (альбо Ніканаўскага) летапісу заўважыў: «*…бысть же сам князь тихъ, и кротокъ, и смирен, и милостивъ, и любя зело и почитая священнический чинъ и иноческый, и прилежаще прочитанію божественныхъ писаній…*» [21, с. 68] (*дадзена мовай арыг.; падкрэсл. мною – В.П.*).

Пра адукаванасць прадстаўнікоў княжацкіх родаў і іх бліжэйшага акружэння таксама сведчыць і матэр’яльна-культурная спадчына тагачасных зямель сучаснай Беларусі. Маюцца рэчавыя пацверджанні ведання граматы прадстаўнікамі эліты полацкага грамадства. Так, вядома пячатка полацкага князя Ізяслава (канец X ст.), знойдзеная ў 1954 г. у Ноўгарадзе, дзе маецца адбітак знака Рурыкавічаў «трызубец» з характэрнай адзнакай і надпіс «Ізяславос», выкананы на грэчаскі манер.

(Даведка: У жніўні 2024 г., дарэчы, беларускімі археолагамі падчас раскопак на гарадзішчы летапіснага Менска знойдзена донца глінянага гаршка з тым жа геральдычным знакам (гербам), што належаў полацкаму князю Ізяславу. Заяву для СМІ пра гэта зрабіў кіраўнік археалагічных раскопак кандыдат гістарычных навук А.В. Вайцяховіч [22] (*канец Даведкі*)).

На сенняшні дзень вядомы пячаткі полацкіх княгінь. Што таксама паказчык, прычым нават жаночай, адукаванасці. Пячаткі Еўфрасінні Полацкай [23, с. 13–18] і яе маці Сафіі, пра дзейнасць якіх расійскі даследчык У.Л. Янін гаварыў, як пра пэўны перыяд у эвалюцыі

полацкай дзяржаўнасці – «полацкі матрыярхат» [24, с. 17–19]. Знойдзены і пячаткі епіскапаў Дыяніса і Міны (12 ст.). Усяго пяць пячатак полацкай гісторыі як сведчанне пашырэння адукацыі сярод яе дзяржаўных і рэлігійных дзеячоў.

Матэрыяльным сведчаннем адукаванасці людзей на тэрыторыі Беларусі ў эпоху існавання першых дзяржаўных утварэнняў з’яўляюцца берасцяныя граматы, Барысавы камяні, графіці (надпісы), створаныя мясцовымі жыхарамі як на тэрыторыі Беларусі, так і ў суседніх рэгіёнах, а таксама археалагічныя знаходкі прылад для пісьма – «пісалаў».

Вядома, адукаванасць беларускіх рэлігійна-асветных дзеячоў (прадстаўнікоў феадальнага саслоўя): Кірылы Тураўскага [25, с. 57–63], Аўраамія Смаленскага і Клімента Смаляціча, пра што сказана ў царкоўна-жыційнай літаратуры і пацверджана іх творамі, некаторыя з якіх дайшлі да нашых дзён [26]. Прычым гэта была не элементарная, а сярэдняя (а можа і вышэйшая) па тагачасных мерках адукацыя. Што ўключала ў сябе веданне граматыкі, рыторыкі і дыялектыкі (г.зн.: вядомага на той час у Еўропе: «трывіуму»).

Украінскі даследчык А.П. Талочка, напрыклад, абапіраючыся на артыкул вучонага з Гарварда (*«Франклін, С. Кнігазнаўства і кніжнікі ў Кіеўскай Русі ...»* [27, p. 838–843]), выказаў меркаванне, што Клімент Смаляціч, якога называлі *«Філосаф»* (*«такъ якоже в Роускои земли не бАшеть»*), у маладосці да свайго прызначэння мітрапалітам *«...прайшоў фармальнае навучанне ў адной са школ Канстантынопаля»* [28].

Унікальнай з’явай для той эпохі была жаночая адукаванасць. І тут беларускія землі не саступалі многім іншым краінам Еўропы і Свету. Вядома, што ў Полацкім княстве існавала першая ва Усходняй Еўропе манастырская школа для дзяўчынак. Заснаваная беларускай хрысціянскай першаасветніцай Ефрасінняй Полацкай у XII ст. Сама Ефрасіння (гг. ж.: каля 1104 – каля 1167), унучка полацкага князя Усяслава Брачыславіча (Чарадзея), пра якога пісаў аўтар «Слова пра паход Ігаравы», атрымала адукацыю ў Полацку.

Аб яе гарачай любові да хрысціянскага самаўдасканалення сказана ў царкоўна-жыційным літаратурным творы «Аповесць пра Ефрасінню Полацкую» [29]. Яе прыхільнасць да рэлігійнай этыкі і цяга да вучобы нават прыводзілі ў здзіўленне бацькоў. Яна была вельмі здольная да «кніжнай навукі», прычым выявіла гэта яшчэ не дасягнуўшы паўналецця. Родныя шчыра дзівіліся такім яе здольнасцям і настойлівасці ў дасягненні мэты. Аўтар падкрэслівае, што слава пра яе прыгажосць, душэўнае харaство і прагу да навук далёка разышлася па гарадах і весях Полацкай зямлі [30, с. 196]. Наперакор бацькам, якія хацелі аддаць яе замуж, Ефрасіння пастрыглася ў манахі, атрымала адукацыю, пачала перапісваць кнігі і займацца асветніцтвам. Праз некаторы час яна ўзначаліла манастыр і яшчэ больш пашырыла актыўную асветніцкую дзейнасць.

Каля 1124 г. у мястэчку Сяльцо пад Полацкам яна заснавала жаночы Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр, дзе арганізавала школу для дзяўчынак. Вядомы і першыя вучаніцы гэтай школы (таксама выхадцы з княжацкага асяроддзя) – яе малодшая сястра Гардзіслава (Еўдакія) і стрыечная сястра Звеніслава Барысаўна (Еўпраксія). Каля 1132 г. пачалося будаўніцтва мужчынскага манастыра. Пры ім ігуменя таксама заснавала школу, але на гэты раз для хлопчыкаў. Заснаваныя ёю манастыры сталі асяродкам асветы ў Полацкім княстве, пры іх працавалі не толькі школы-вучэльні для дзяцей, дзе выкладалі чытанне, пісьмо, нотную грамату, магчыма, грэчаскую мову, але былі і бібліятэкі, скрыпторыі, верагодна, іканапісная і ювелірная майстэрні.

Сучасная беларуская даследчыца І.Л. Калечыц, якая рознабакова і пераканаўча прааналізавала надпісы на сценах полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы, пабудаванай па замове Еўфрасінні Полацкай у XII ст., у першай главе сваёй чарговай манаграфіі [31, с. 8–11], што выдадзена ў 2025 г., ставіць наватарскае пытанне : «Ці была Прападобная Еўфрасіння – аўтарам “суправаджальных” надпісаў (тых што змешчаны пад выявамі аздаблення сцен храма)?» Адказ на яго, заснаваны на прадстаўленых навуковых дадзеных, даволі пераканаўчы. Так, была !

Зразумела, што такое сцверджанне яшчэ не з’яўляецца канчатковым. Пэўная гіпатэтычнасць тэорыі, безумоўна, прысутнічае. Але тое, што ўраджэнка тэрыторыі Беларусі XII ст., выбітная асветніца, кіраўнік хрысціянскай абіцелі (ігуменя), магла быць (ці была) распрацоўшчыцай зместу надпісаў (а можа нават, у асобных выпадках і ўласнаручнай іх выканальніцай), якія сведчаць пра глыбокае веданне царкоўнай гісторыі (на ўзроўні «філосафа», ці «кніжніка») і дактрынальных дагматаў тагачаснага хрысціянства – паказчык вельмі красамоўны.

І ён найперш – пра адукаванасць. Глыбокую («кніжную»), адпаведную тагачасным правілам. Вынікі якой «фізічна» захаваліся да нашых дзён і ўяўляюць сабой унікальную (непаўторную) гістарычную крыніцу, што пераканаўча сведчыць велічнасць гісторыі нашага беларускага народа.

**Заключэнне.** Завяршаючы гаворку пра пераход ад традыцыйнай да кніжнай адукаванасці на беларускіх землях у IX–XIII стст., неабходна адзначыць, што:

– гістарычны ракурс дзеяння тэрміна «адукава́насць» ахоплівае два яе віды, якія мелі месца ў жыцці чалавецтва. «Традыцыйную», існуючую ў гісторыі любога грамадства і ў любы гістарычны перыяд, і «кніжна-пісьмовую». Якая сфарміравалася пазней і паступова выцесніла паняцце «традыцыйная адукава́насць» з навуковага і сацыяльна-жыццёвага ўжытку;

– традыцыйная адукаванасць эпохі першабытнасці, што набывалася падчас ажыццяўлення гістарычнай трансляцыі сацыяльнага досведу шляхам ініцыяцый, ляжала ў аснове гістарычнага прагрэсу як цэнтральная (вызначальная) рыса грамадска-гістарычнай эвалюцыі чалавецтва;

– працэс пераходу ад аднаго да другога, названых вышэй, відаў адукаванасці на беларускіх землях адбыўся ў прамежку IX–XIII стст.;

– важнейшымі матывацыйнымі фактарамі, што прымусілі грамадства да пераходу ад традыцыйнай да кніжна-пісьмовай адукаванасці, былі зараджэнне дзяржаўнасці на этнаграфічна беларускіх землях і хрысціянізацыя ўсходнееўрапейскага рэгіёна;

– хрысціянства ў працэсе пераходу ад традыцыйнай да кніжнай адукаванасці, як заўважыў Г.М. Філіст, *«ажыццяўляла працяг»* і было «паскаральнікам» (рэтранслятарам) такой важнай з'явы, як кніжная адукаванасць. Выконваючы царкоўна-палітычныя задачы па экспансіі царквы на новыя тэрыторыі, яно рыхтавала з ліку мясцовага насельніцтва царкоўных слу́жак і тым самым спрыяла пашырэнню элементарных асноў пісьме́ства;

– важнымі матывацыйнымі фактарамі пераходу, акрамя зараджэння дзяржаўнасці і хрысціянізацыі, былі надзённыя патрэбы функцыянавання мясцовых зямель-княстваў (гандлёва-мытныя задачы, падатковая сістэма, ды інш.), што абапіраліся на спрыяльныя геапалітычныя магчымасці беларускіх зямель (найперш рачныя шляхі зносін);

– прамежкавым, пры пераходзе ад «традыцыйнай» да «кніжна-пісьмовай» адукаванасці, быў перыяд разлажэння першабытных адносін. Яго рысамі былі з'яўленне саслоўна-класавага падзелу насельніцтва і ўсталяванне язычніцтва ў якасці асноўнай грамадскай ідэалогіі. Змены ў выхаваўча-адукацыйным працэсе гэтага перыяду выявіліся ў пераходзе ад агульна-родавых ініцыяцый, да падрыхтоўкі моладзі ў межах сваіх сацыяльна-прафесійных груповак. Прычым, чытанне, пісьмо і лічэнне у той час яшчэ не былі часткай зместу адукацыі. Перадаваліся толькі прафесійныя і сацыяльна-статусныя каштоўнасці.

## Літаратура


1. Оглашение [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://azbyka.ru/oglashenie. – Дата доступа : 09.11.2024.

2. Daniélou, J. La catéchèse aux premiers siècle / J. Daniélou // Rédigé par Régine du Charlat / Collection Ecole de la foi. – Paris : Fayard-Mame, 1968. – 267 p.

3. ПСРЛ. – СПб. : Тип. Эдуарда Праца, 1846. – Т.1 : Лаврентиевская и Троицкая летописи. – 267 с.

4. Срезневский, И. И. Материалы для словаря древнерусского языка по письменным памятникам / И. И. Срезневский. – СПб. : Тип. Императорской АН, 1902. – Т. 2 : Л–П. – 1802 с.

5. Срезневский, И. И. Материалы для словаря древнерусского языка по письменным памятникам / И. И. Срезневский. – СПб. : Тип. Императорской АН, 1903. – Т. 3 : Р–Я. – 1684 с.

6. Блок, М. Феодальное общество / М. Блок ; пер. с фр. М. Ю. Кожевниковой, Е. М. Лысенко ; под ред. Н. С. Малевич. – М. : Изд. им. Сабашниковых, 2003. – 504 с.

7. Отвергни себя [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://goo.su/fo4wuk. – Дата доступа : 23.01.2025.

8. От Луки святое благовествование [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.bible.com/ru/bible/400/LUK.9.SYNO. – Дата доступа : 24.02.2025.

9. Штец, А. А. Обучение грамоте в Древней Руси (X–XV века) [Электронный ресурс] / А. А. Штец // Режим доступа : https://russianclassicalschool.ru/bibl/slovesnost/obuchenie-gramote/item/1601-a-a-shtets-obuchenie-gramote-v-drevnej-rusi-kh-khv-vv.html. – Дата доступа : 24.02.2025.

10. Жучкевич, В. А. Дороги и водные пути Белоруссии : ист.-геогр. очерки / В. А. Жучкевич. – Минск : Изд. БГУ им. В.И. Ленина, 1977. – 144 с.

11. Алексеев, Л. В. По Западной Двине и Днепру в Белоруссии / Л. В. Алексеев. – М. : Искусство, 1974. – 295 с.; Павулан, А. А. Хозяйственное и политическое значение даугавского торгового пути в XIII–XVII вв. / А. А. Павулан // Экономические связи Прибалтики с Россией : сб. ст. – Рига, 1968. – 257 с.

12. Перхавко, В. Б. Припятско-Бугский путь в IX–XIII вв. / В. Б. Перхавко // Основные проблемы исторической географии России на современном этапе : тез. докл. ; отв. ред. Л. Г. Бескровный. – М. : Изд-во Ин-та истории СССР, 1980. – 191 с. ; Іоў, А. В. Днепра-Бугскі водны гандлёвы шлях / А. В. Іоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. ; рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3. : Гімназіі–Кадэнцыя. – 527 с.

13. Бернштейн-Коган, С. В. Путь из варяг в греки / С. В. Бернштейн-Коган // Вопросы географии : сб. 20. – М. : Наука, 1950. – 311 с. ; Савачкін, П. З. Шлях з «Варагаў у грэкі» / П. З. Савачкін // Беларуская энцыклапедыя : У 18 т. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 17 : Хвінявічы–шчытні. – 512 с.

14. Подаляк, Н. Г. Могутня Ганза. Комерційний простір, міське життя і дипломатія XII–XVII століть / Н. Г. Подаляк. – Київ : Темпора, 2009. – 360 с.

15. Казлоў, Л. Р. Агінскі канал // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Л. Р. Казлоў ; рэдкал. М. В. Біч [і інш.] ; прадм. М. А. Ткачова. – Мінск : БелЭн, 1993. – Т. 1 : А–Беліца. – 494 с.

16. Зайкоўскі, Э. М. Калі на Беларусі з’явілася пісьмо? / Э. М. Зайкоўскі // Спадчына. – 1992. – № 2. – С. 13–17.

17. Ермаловіч, М. І. Старажытная Беларусь : Полацкі і новагародскі перыяды / М. І. Ермаловіч. – 2-е выд. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. – 366 с.

18. Ярлык данный от Кипчакского Царя Узбека Петру Митрополиту всея России (ок. 1313 г.) // Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в Государственной коллегіи иностранных дел. Часть вторая, служащая дополнением к первой. – М. : Тип. Селивановского, 1819. – 289 с.

19. О Русская земля! /Сост., предисл. и примеч. В. А. Грихин. – М. : Сов. Россия, 1982. – 368 с.

20. Изборник Святослава 1073 г. : сб. ст. / Научный совет по истории мировой культуры АН СССР ; отв.ред. Б. А. Рыбаков ; ред. Л. П. Жуковская [и др.]. – М. : Наука, 1977. – 313 с.

21. ПСРЛ. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1862. – Т.9 : Патріаршая или Никоновская летопись. – 256 с.

22. В Белоруссии найден уникальный археологический артефакт [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://goo.su/k5gCU6n. – Дата доступа : 23.01.2025.

23. Дук, Дз. У. Пячатка Еўфрасінні Полацкай / Дз. У. Дук, І. Л. Калечыц, А. Л. Коц // Беларускі гістарычны часопіс. – 2015. – № 7. – С. 13–18.

24. Янин, В. Л. Полоцкий «матриархат» / В. Л. Янин // Знание сила. Ежемесячный научно-популярный и научно-художественный журнал для молодежи. – 1970. – № 12. – С. 17–19.

25. Пілецкі, В. А. «Адрочаныя» кнігі Кірылы Тураўскага як адна са з’яў паўсядзённасці і культуры Беларусі XII ст. / В. А. Пілецкі // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : вывучэнне і захаванне : зб. навук. арт. : у 2 т. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2012. – Т. 2. – 254 с.

26. Мельнікаў, А. А. Кірыл, епіскап Тураўскі : Жыццё. Спадчына. Светапогляд / А. А. Мельнікаў. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 462 с.

27. Franklin, S. Booklearning and Bookmen in Kievan Rus’: A Survey of an Idea / S. Franklin // Harvard Ukrainian Studies. – 1988–1989. – V. 12–13. – P. 830–848.

28. Толочко, А. П. Клим Смолятич после низвержения из митрополии [Электронный ресурс] / А. П. Толочко. – Режим доступа : https://goo.su/wHunUd. – Дата доступа : 07.03.2025.

29. Кніга жыцій і хаджэнняў / Уклад., прадм. і каментарыі А. Мельнікава ; пер. са старжытнарус., старабеларус. і польск. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – 503 с.

30. Еўфрасіння Полацкая / аўтар-уклад. У. А. Арлоў. – Мінск : Полымя, 2000. – 272 с.

31. Калечыц, І. Л. Палеаграфічная спадчына полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы : суправаджальныя надпісы на фрэсках і пытанне аўтарства / І. Л. Калечыц. – Мінск : Бел. навука, 2025. – 135 с.

Институт истории НАН Беларуси

Поступила в редакцию 21.03.2025